- Фіксацыя факта пражывання асобы на тэрыторыі Жаснянскай воласці былой Віленскай губерніі на момант 1 верасня 1914 г. у дакументах справаводства мясцовых даваенных органаў улады [3].

- Даваенныя расійскія (заўв. дарэвалюцыйныя) пасведачанні асобы, як адна з крыніц для пацдверджання факта пражывання апошняй да Першай сусветнай вайны. Гэты масіў дакументаў фактычна адсутнічае, так як, у моц абставін, дакументы маглі быць страчаны асобай пад час Першай сусветнай вайной [3]. Магчымай прычынай адсутнасці дакументаў у матэрыялах справаводства Жаснянскай гміны Дунілавіцкага павета (з 1926 г. – Пастаўскага павета) з'яўляецца знічшэнне дарэвалюцыйных пасведчанneў асоб пасля выдачы польскіх дакументаў, так як першыя ўжо перасталі дзейнічаць у моц знікнення органаў іх выдачы і Расійскай імперыі ўвогуле.

Захаванне анкеты ў матэрыялах справаводства сведчыць аб паспяховым праходжанні працэса рэгістрацыі экс-бежанца. Апошні, па выніках рэгістрацыі, атрымліваў пасведчанне аб нараджэнні [5]. З мая 1921 г., пасля сканчэння польска-савецкай вайны, пачалася выдача легітымацый (заўв. пасведчанне асобы). Працэдура анкетавання асоб захавалася да 1939 г. і распаўсюдзілася на справаводствы іншых дзяржаўных устаноў міжваеннай Польшчы [12, с. 28].

Запаўненне анкеты праводзілася на падставе дакуменаў, прадстаўленых асобай пры рэгістрацыі і/ці перарэгістрацыі (аўтабіяграфія, даваенныя дакументы, метрычныя кнігі і інш.) і матэрыялаў справаводства мясцовых даваенных органаў улады. Мова анкет – польская. Мова аўтабіяграфій – польская і руская, што звязана з распаўсюдам рускамоўнай адукацыі і валоданнем польскай мовай часткай насельніцтва. Фіксуюцца эпізоды звяртання ў дзяржустановы маладукаванай ці неадукаванай часткі насельніцтва, што фіксуецца ў матэрыялах справаводства мясцовых органаў улады. Па выніку рэгістрацыі, у межах якой праводзілася анкетаванне, асобе выдавалася часовае пасведчанне асобы, а пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы, з мая 1921 г., пачалася выдача пастаянных пасведчанняў асоб. Даваенныя рускія пасведчанні асобы не захаваліся ў матэрыялах справаводства Дунілавіцкага павета, што звязана як са стратай апошніх так і стратай сэнсу ў захоўванні недзейных дакументаў.


1. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладэчна (далей – ЗДАМал.). – Ф. 56. Воп. 1. Спр. 11. Л. 26.
2. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 1. Спр. 19. Л. 2.
3. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 1. Спр. 35. Л. 1.
4. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 3.
5. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 21.
6. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 23.
7. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 81.
8. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 94.
9. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 128.
10. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 220.
11. ЗДАМал. – Ф. 388. Воп. 1. Спр. 4. Л. 2.
12. Згірскі, Ю. І. Латвійскі напрамак працоўнай эміграцыі ў дакументах гарадскога суда мястэчка Друя ІІ Рэчы Паспалітай / Ю. І. Згірскі // Электронный сборник трудов молодых специалистов Полоцкого государственного университета имени Евфросинии Полоцкой / ред. кол.: Ю. Я. Романовский (пред.) [и др.]. – Новополоцк : Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой, 2022. – Вып. 43 (113): Образование. Педагогика. – С. 28–30.



**Ананька К.Д.**


## УСПАМІНЫ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЙ У МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўспаміны выкарыстоўваюцца як крыніцы для даследавання пастаўленай праблемы. У савецкай гістарыяграфіі ўспаміны і мемуары класіфікаваліся даследчыкамі як суб'ектыўныя крыніцы і выкарыстоўваліся ў якасці дадатку да іншых дакументаў. У сувязі з пашырэннем выкарыстання новых метадалагічных падыходаў у 1990-х гг. заходняй гістарычнай навуцы, а затым і ў беларускай стала папулярным выкарыстанне эга-дакументаў з мэтай даследавання асобных праблем. Эга-дакументы – катэгорыя шырокага значэння, якая ўключае ўспаміны, мемуары, пратаколы апытанняў, жыццяпісу, эпісталярныя крыніцы і г. д.

У апошні час у гістарычным навуковым дыскурсе папулярным становіцца выяўленне і стварэнне біяграфій раней невядомых або малавывучаных дзеячаў, а таксама прасапаграфічныя даследаванні – пабудова калектыўных біяграфій асобных катэгорый людзей. На думку даследчыка беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі А. С. Горнага падобныя даследаванні патрабуюць грунтоўнага аналізу асабістых дакументаў, у тым ліку і ўспамінаў. Вывучэнне ўласнага «я» дазваляе ўбачыць інтэлектуальныя магчымасці і пошукі беларускіх нацыянальных дзеячаў, складанасці іх выбару і ў цэлым умовы іх дзейнасці [1, с. 295]. Да крыніц па разглядаемай тэме адносяцца ў асноўным ужо апублікаваныя ўспаміны былых супрацоўнікаў і навучэнцаў гімназій – Янкі Багдановіча [2], Ігара

Бурсевіча [3], Мікалая Бурсевіча [4], Леаніда Галяка [5], Раісы Галяк [6], Анелі Катковіч [7], Зоі Коўш [8], Святаслава Коўша [9], Вітаўта Тумаша [10, 11, 12, 13]. У ф. 1 і ф. 35 Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўтрымліваюцца ўспаміны былых выпускнікоў Віленскай беларускай гімназіі Янкі Шутовіча [14] і Якуба Міско [15].

Адным з першых апавяданняў пра вучобу ў Віленскай беларускай гімназіі (ВБГ) стаў артыкул «Уступаючы ў жыццё...» М. Бурсевіча, апублікаваны ў 1958 г. М. Бурсевічам, які з'яўляўся братам І. Бурсевіча. Ён паступіў адразу ў 3 клас гімназіі ў 1929 г. Асноўны змест успамінаў у большай ступені раскрывае грамадска-палітычную сітуацыю сярод вучняў. У другой палове 1920-х гг. сярод навучэнцаў сталі хутка распаўсюджвацца камуністычныя ідэі па лініі КПЗБ, ладзілася антыўрадавая дзейнасць. У 1929 г. М. Бурсевіча, як і некаторых іншых навучэнцаў, адлічылі па прычыне камуністычнай дзейнасці, пасля чаго яны перайшлі ў Клецкую беларускую гімназію, дзе працягвалі сваю камсамольскую дзейнасць [4, с. 134–141]. Ён раскрытыкаваў бяздзейнасць гімназічнай адміністрацыі і асабліва Р. Астроўскага, называя яго здраднікам. Успаміны М. Бурсевіча напісаны ў камуністычным духу, падкрэсліваючы барацьбу беларускіх камсамольцаў супраць польскіх уладаў. У падобным кантэксце напісаны мемуары вядомага беларускага публіцыста Я. Міско, якія знаходзяцца ў асабістым фондзе аддзелу рукапісаў ЦНБ НАНБ. Ён таксама навучаўся ў сценах ВБГ і быў удзельнікам тых падзей, асабіста сябраваў з Я. Урбановічам і В. Таўлаем, з якімі разам здзяйсняў антыўрадавыя акцыі пратэсту, вёў камсамольскую дзейнасць у гімназіі [15, арк. 23–24]. З асаблівасцяў гэтых мемуараў можна падкрэсліць формы і метады палітычнай актыўнасці, якой карысталіся навучэнцы пры арганізацыі розных акцый пратэсту, супраціўлення і г. д.

У чэрвені 1978 г. у свет выйшлі ўспаміны былога навучэнца ВБГ І. Бурсевіча, які навучаўся ў ёй з 1923 па 1929 гг. Аўтар падзяліў свае ўспаміны па раздзелах: размяшчэнне будынку, умовы працы ўстановы, навучальны працэс, палітычныя абставіны ў Заходняй Беларусі. У апошнім раскрываецца грамадска-палітычная і культурная актыўнасць навучэнцаў, іх удзел у дзейнасці КПЗБ, камсамола, БСРГ, ТБШ [3, с. 140–141]. Нягледзячы на тое, што І. Бурсевіч сам быў уцягнуты ў актыў камсамола, яго ўспаміны носяць у большай ступені апісальны характар. Аўтар згадвае свае сяброўскія сувязі з Я. Урбановічам, А. Салагубам, В. Таўлай, Х. Ільяшэвічам і іншымі, а таксама свайго бацьку М. Т. Бурсевіча, які з'яўляўся кіраўніком Цэнтральнага сакратарыята БСРГ. У адзін момант польскія ўлады яго арыштавалі па справе Грамады, што паўплывала на далейшы лёс самога І. Бурсевіча. У 1929 г., не давучыўшыся яшчэ адзін год у гімназіі, сям'я Бурсевічаў разам з сям'ёй С. Рак-Міхайлоўскага былі вымушаныя выехаць у БССР.

Каштоўнымі для вывучэння тэмы дзейнасці беларускіх гімназій з'яўляюцца ўспаміны С. і З. Каўшоў, дзяцей былога праваслаўнага законавучыцеля ВБГ А. Каўша. З. Коўш, якая выпусцілася з гімназіі ў 1929 г., у сваіх успамінах раскрыла вядомы тэзіс "беларускія гімназіі – кузні нацыянальных кадраў". У большай ступені яна звярнула ўвагу на культурна-выхаваўчую працу, прааналізавала абставіны знішчэння ўстановы [8, с. 34–36]. Прычынай такога зыходу падзей стала супярэчнасць, якая перарасла ў адкрытае супрацьстаянне паміж гімназістамі і адміністрацыяй у асобе былога дырэктара Р. Астроўскага. Успаміны С. Каўша ўвайшлі ў змест «Летапіс Віленскай беларускай гімназіі» часопіса «Спадчына» у 1999 г. У сценах гімназіі С. Коўш апынуўся пасля арышту польскімі ўладамі яго бацькі, што аказала некаторы ўплыў на яго непрыязнасць да настаўніка польскай мовы на папярэднім месцы вучобы [9]. Перыяд яго вучобы ў 1929–1934 гг. прыпадае на пераломны момант для ВБГ, калі ўстанова стала філіялам польскай гімназіі ў 1932 г. Карысным для даследавання з'яўляецца спіс выкладчыкаў, сярод якіх фігуруюць і былыя навучэнцы, напрыклад, М. Ільяшэвіч, Б. Кіт і іншыя.

У 1923–1931 гг. у ВБГ навучалася Р. Галяк. У сваіх успамінах яна дала асабістую характарыстыку некаторых выкладчыкаў гімназіі – В. Багдановіча, Р. Астроўскага, І. Дварчаніна, М. Сіняўскага і іншых. Менавіта Р. Галяк адна з нямногіх звярнула ўвагу на тое, што некаторыя вучні і супрацоўнікі былі "хадэтамі" – прыхільнікамі партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" (БХД). "Хадэтамі" яна называла загадчыцу інтэрната М. Шутовіч, сястру згаданага Я. Шутовіча, і тых, хто блізка сябраваў з настаўнікам А. Станкевічам [6, с. 44]. Карыснымі для даследвання з'яўляюцца ўспаміны яе мужа, Л. Галяка, вядомага беларускага дзеяча ў эміграцыі. Ён добра апісаў настаўнікаў і вучняў, з якімі ён кантактаваў на працягу сваёй вучобы ў 1922–1930 гг. [5]. Гэтыя ўспаміны могуць стаць вельмі карыснымі для складання прасапаграфічных даследванняў беларускіх дзеячаў у Заходняй Беларусі.

Да падобнай катэгорыі ўспамін можна аднесці змястоўныя мемуары В. Тумаша, таксама былога вучня ВБГ. Яны былі апублікаваны ў 4-х частках часопіса «Полацак» у 1992 г. і ўтрымліваюць інфармацыю пра паўсядзённае жыццё навучэнцаў, іх грамадска-палітычную і культурную актыўнасць, апісанне выкладчыкаў, зместу іх заняткаў і г. д. [10–13]. Даследчык А. Горны ахарактарызаваў ўспаміны В. Тумаша і Л. Галяка як "грунтоўныя дапаможнікі" пры даследванні прасапаграфіі настаўнікаў і вучняў [1, с. 290]. Таксама карысным для падобнага даследвання могуць стаць мемуары Я. Шутовіча, вучня ВБГ у 1919–1924 гг. Ён стаў адным з нямногіх, хто ў сваіх мемуарах закрануў пы-

танне сацыяльнага і нацыянальнага складу вучнёўскага кантынгенту. Справа ў тым, што ў першыя гады існавання ВБГ, значная колькасць навучэнцаў паходзіла з сялянскіх сямей, а таксама складалася з прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці [14, арк. 5–6].

Успаміны былой вучаніцы ВБГ А. Катковіч, на жаль, не з'яўляюцца дастаткова падрабязнымі, так як аўтар апісала асабістыя ўражанні і супераважыванні падчас вучобы. Аднак з іх можна падкрэсліць цяжкасці іншагародніх навучэнцаў, якія былі вымушаныя самастойна ў літаральным сэнсе выжываць у цяжкіх эканамічных умовах. Напрыклад, сама А. Катковіч была на апякунстве беларускага дзеяча Э. Будзькі, які і дапамог ёй паступіць у ВБГ [7, с. 30]. Прыгэтым аўтары і рэдактары ўспамінаў пастараліся зафіксаваць кожную згаданую асобу кароткай біяграфічнай даведкай.

Такім чынам, у большай ступені разглядаемая катэгорыя крыніц прадстаўлена ўспамінамі былых вучняў беларускай гімназіі ў Вільні. Шмат даследчыкаў характарызуюць яе як вучэбна-метадычны цэнтр, доўгі час рыхтаваўшы прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Вялікая частка з іх ужо апрацавана і апублікавана, што палягчае магчымасць даследчыкам працаваць з гэтымі крыніцамі. З іх можна падкрэсліць шмат інфармацыі пра грамадска-палітычныя абставіны, умовы існавання і працы, характарыстыку супрацоўнікаў і навучэнцаў і г. д. Успаміны, як адзін са складнікаў комплексу эгадакументаў, у пары з іншымі відамі крыніц могуць стаць важнай базай для стварэння прасапаграфічных даследаванняў, якія набіраюць папулярнасць у сучаснай беларускай гістарыяграфіі.


1. Горны, А. С. Эга-дакументы як крыніцы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі / А. С. Горны // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2020. – Т. 65, № 3. – С. 286–297.
2. Багдановіч, Я. На жыццёвым шляху: Успаміны / Я. Багдановіч. – Мінск : Маст. літаратура, 1992. – 144 с.
3. Бурсевіч, І. Віленская беларуская гімназія / І. Бурсевіч // Маладосць: штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс. – 2011. – № 4. – С. 136–141.
4. Бурсевіч, М. В. Уступаючы ў жыццё... / М. В. Бурсевіч // У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Інстытут гісторыі партыі ЦК КП Беларусі. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – С. 133–141.
5. Галяк, Л. Успаміны. Кніга 1. [Электронны рэсурс] / Л. Галяк. – Рэжым доступа: https://knihi.com/Leanid_Halak/Uspaminy.html. – Дата доступа: 26.12.2022.
6. Галяк, Р. Настаўнікі Віленскай Беларускай гімназіі / Р. Галяк // Полацак. – 1993. – № 3. – С. 41–45.
7. Катковіч, А. Успаміны / А. Катковіч, В. Катковіч-Клентак. – Беласток : Беларускае Гістарычнае Таварыства, 1999. – 117 с.
8. Коўш, З. Віленская гімназія / З. Коўш // Беларуская мінуўшчына. 1995. – № 1. – С. 34–36.
9. Летапіс віленскай беларускай гімназіі 1919–1944 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/_memoirs/203/Летапіс_віленскай_беларускай_гімназіі_1919-1944.html. – Дата доступа: 25.12.2022.
10. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 3. – С. 50–52.
11. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 4. – С. 54–57.
12. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 5. – С. 49–51.
13. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 9. – С. 37–40.
14. ЦНБ НАНБ. АРКР. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 64.
15. ЦНБ НАНБ. АРКР. – Ф. 35. Воп. 1. Спр. 94.


**Бароўская В.М.**

## КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ УЗАЕМАДАЧЫНЕННЯЎ 1921–1939 ГГ.

Крыніцы даследавання можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп. У першую чаргу гэта матэрыялы расійскіх, польскіх і беларускіх архіваў, якія дазваляюць выявіць шматлікія матывы бакоў, а таксама невядомыя даследчыкам падзеі і рашэнні. Каштоўныя данныя, якія маюць ключавое значэнне для ўсталявання прычын рашэнняў, якія прымаліся савецкім кіраўніцтвам адносна беларускага пытання, утрымліваюць дакументы Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ), у прыватнасці фонд сакратарыята Народнага камісара замежных спраў (НКЗС) Г.В. Чычэрына (ф. 4/04), фонды рэферэнтур па Польшчы (ф. 122/0122) і Літве (ф. 151/0151), матэрыялы савецка-германскай, савецка-літоўскай і савецка-польскай мірнай канферэнцый, а таксама фонды членаў Калегіі НКЗС М. М. Літвінава, А. А. Іофе і Я. С. Ганецкага, М. М. Красцінскага. Прадстаўляе цікавасць перапіска Г. В. Чычэрына, П. Л. Войкава, членаў Калегіі НКЗС паміж сабой і іншымі дыпламатамі, запісы іх размоў, даклады, артыкулы і прамовы Г.В. Чычэрына па міжнародных пытаннях, інфармацыйныя агляды НКЗС, агляды замежнага друку, пераклады дыпламатычных дакументаў замежнага паходжання і інш. Навуковая значнасць гэтых матэрыялаў заключаецца ў разуменні асаблівасцей фарміравання і трансфармацыі знешнеэканамічных курсаў Польшчы, СССР, Германіі і заходнееўрапейскіх краін.

Матэрыялы па беларускім пытанні прадстаўлены значным масівам навуковых выкладак, дакладаў аб этнаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне, дыялектах і арэале іх распаўсюджвання, параўнальных табліц па перапісам насельніцтва, аналізу поглядаў розных навукоўцаў і палітычных груп па праблеме межаў рассялення беларусаў. Такія даклады складаліся ў тэрміновым фармаце ў 1917 г. да Брэсцкай канферэнцыі (ф. 413) і больш дэталёва ў 1920 г. для савецка-літоўскай канферэнцыі.